■ Аліментная справа

# МОЙ ТАТА — НЕВІДЗІМКА...

## Ухілісты, якія не жадаюць падтрымліваць сваіх дзяцей, застануцца без мабільнай сувязі і інтэрнэту

**Чатырохгадовы Вадзік свайго бацькі не памятае. Той кінуў маці, калі хлопчыку было ўсяго паўгода. Незарэгістраваны шлюб, зрабіць гэта было нескладана. А цяпер Віктар не плаціць на ўтрыманне сына ні капейкі, хоць экспертыза ДНК пацвердзіла яго бацькоўства.**

Калі не атрымліваецца вырашыць пытанне па згодзе, то варта падаць пазоў аб спагнанні з яго аліментаў, параіла я сваёй знаёмай. Ірына гэта зрабіла, рашэнне судом вынесена, але яна чакае выплат некалькі месяцаў. Віктар у Мінску з'яўляецца рэдка. Афіцыйнага месца працы ў яго няма. Ён увогуле, нібыта чалавек-невідзімка. Хоць і нябедны. На мабільны тэлефон траціць у месяц столькі, што хапіла б малому на адзенне і абутак.

І вось цяпер такім, як гэты гора-бацька, давядзецца перагледзець жыццёвыя прыярытэты. Як заўважае **першы намеснік міністра юстыцыі Беларусі Валерый КУЛАКОЎСКІ**, у апошні час судовыя выканаўцы атрымалі магчымасць адключаць даўжнікоў ад сотавай сувязі. Правяраецца па базе, ці ёсць у даўжніка мабільны тэлефон, і ў выпадку неабходнасці ўводзіцца забарона на аказанне аператарам адпаведных паслуг, а таксама арыштоўваюцца і спісваюцца грошы з рахунку.

Таксама судовыя выканаўцы маюць тэхнічную і заканадаўчую магчымасць уводзіць забарону на прадастаўленне для даўжнікоў паслуг інтэрнэту. Гэтыя меры, як вы разумееце, выкарыстоўваюцца ў дачыненні да нябедных хітруноў, якія не жадаюць падтрымліваць сваіх дзяцей.

А ўвогуле, у Беларусі да аліментшчыкаў падыход строгі. У іх вылічваюць грошы не толькі з зарплаты, а з усіх відаў даходу. А яшчэ могуць забраць вадзіцельскія правы. І часовае пазбаўленне камфортнага перамяшчэння на аўто таксама актывізуе тых, хто не жадае ўтрымліваць дзяцей і разлічыцца з даўгамі.

Так, **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве Уладзімір ЧАРАВАЧ** узгадаў выпадак са сваёй практыкі, калі ён быў старшынёй суда Кастрычніцкага раёна сталіцы. Адзін «татка» завінаваціўся больш за сем мільёнаў рублёў аліментаў. І вось аднойчы судовыя выканаўцы ўбачылі, як ён на шыкоўнай машыне пад'язджае да суда, куды яго выклікалі па аплаце штрафу за парушэнне правілаў дарожнага руху. На аўтамабіль быў накладзены арышт, выклікалі эвакуатар, каб даставіць яго на штрафпляцоўку. Як ні абураўся нядобрасумленны бацька, але, каб не заставацца без «колаў», вымушаны быў на працягу гадзіны (!) пагасіць запазычанасць, у тым ліку няўстойку — 0,3% ад сумы за кожны дзень пратэрміноўкі.

Акрамя забароны на карыстанне аўтамабілем, у злоснага «ўхіліста» могуць канфіскаваць маёмасць або накласці на яе арышт (у тым ліку на грашовыя дэпазіты). Неплацельшчыку таксама не дазволяць выехаць за межы Беларусі, пакуль запазычанасць не будзе пагашана. Яшчэ яму могуць забараніць карыстацца маламернымі суднамі, а таксама паляваць. Выключэнне зроблена толькі для інвалідаў і тых, для каго вышэйзгаданае з'яўляецца адзіным сродкам атрымання даходу.

— У нас у гэтай галіне выстраена дакладна палітыка, — адзначае парламентарый. — У прыватнасці, згодна з артыкулам 91 Кодэкса аб шлюбе і сям'і, бацькі абавязаны ўтрымліваць дзяцей да 18 гадоў, а калі яны непрацаздольныя, то і пасля паўналецця. Таксама, каб хтосьці гадамі хаваўся і не плаціў аліменты на сваё дзіця, бывае нячаста. Пра гэта сведчыць і статыстыка. Так, у мінулым годзе ў аддзелах прымусовага выканання толькі 6% выканаўчых дакументаў тычыліся аліментных выплат.

**Вера ПАКРОЎСКАЯ.**

# «ХЭПІ-ЭНД» З СУМНЫМ АСАДКАМ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Як любая маці, Ганна строіць планы, уяўляе, як ён пачне хадзіць, як вымавіць першыя словы. Пра тое, што яе могуць разлучыць з сынам, яна старалася не гаварыць. Але ж нервознасць і напружанасць усё роўна выступалі, іх цяжка было схаваць зусім. Калі загаварылі на тэму хрышчэння, Ганна сказала: «У мяне пытаюць часам, чаму я не хрышчу Косціка. А навошта гэта рабіць у бальніцы? У бальніцы дзяцей хрысцяць, толькі калі яны хворыя, калі... Ну, самі разумееце. А мы будзем дома, у нас жа царква побач, нават везці не трэба: можна малога занесці, можна бацюшку ў кватэру запрасіць. Дома трэба хрысціць, каб прыгожа ўсё, каб запомнілася...»

Ужо другі месяц яна знаходзілася ў бальніцы з малым, і гатовая была, здаецца, цярпець яшчэ колькі заўгодна, толькі б урэшце ўсё скончылася і можна было забраць сына дадому.

**«У мяне пытаюць часам, чаму я не хрышчу Косціка. А навошта гэта рабіць у бальніцы? У бальніцы дзяцей хрысцяць, толькі калі яны хворыя. А мы будзем дома, у нас жа царква побач».**



Фота БЕЛТА.

**Марыяна ШЧОТКІНА: «Трэба падтрымліваць жанчын, матываваных на мацярынства».**

Я была ў Ані ў чацвер. А ў пятніцу з'явілася інфармацыя, што заключэнне ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, згодна з якім інваліды першай групы Ганна і Анатоль Бахуры не могуць выконваць бацькоўскія абавязкі, адменена. Можна было б паставіць кропку. Але так не атрымліваецца. Таму што шмат чаго давялося пачуць не толькі ад самой Ганны, але і ад іншых людзей, у тым ліку ў калідорах улады, што надта хвалюе. Афіцыйныя каментары таго дня прыводзіць няма сэнсу, з прыняццем рашэння яны страцілі актуальнасць. А пра рашэнне райвыканкама адносна сям'і Бахур, прынятае ў пятніцу, мне расказаў **Аляксандр ВЕЛІКАСЕЛЕЦ, намеснік старшыні райвыканкама:**



**Косцік застаўся з бацькамі.**

— Рашэннем райвыканкама для сям'і, якая трапіла ў складаную жыццёвую сітуацыю, адкрылі стаўку нянькі. Для зручнасці работнікаў будуць прыняты на працу дзве жанчыны, на паўстаўкі кожная.

Вось і знайшлося рашэнне. І вельмі разумна, што нянькі дзве, па чарзе яны будуць хадзіць на выхадныя. Але ж відавочна, каб не ўмяшанне міністра Марыяны Шчоткінай, віцэ-прэм'ера Наталлі Качанавай, іншых афіцыйных асоб, дзіця бацькам не аддалі б.

Прыводжу кароткі дыялог у Івацэвіцкім райвыканкаме ў мінулы чацвер:

— Яна не можа выконваць бацькоўскія абавязкі, — гаворыць адзін з чыноўнікаў.

— Але яна іх выконвае ўжо месяц, — кажу я.

— А што нам скажа пракурор?

І гэта, здаецца, апошні жалезны аргумент улады: нехта некага абавязкова пакарае, калі не будзе зроблена па напісаным. Дзіця, яго маці, сям'я тут — справа дзясятая, галоўнае бы забралі маму з дзіцем у адну са сталічных клінік і правялі экспертызу наконт таго, можа яна выконваць свае мацярынскія абавязкі ці не. А чаму для гэтага трэба везці сям'ю ў сталіцу? Ці не прасцей было б адправіць іх дадому, а потым работнікам апекі зайсці ды паглядзець? Калі дзіця, умоўна кажучы, галоднае, нямытае, у хаце вэрхал, то вось вам і падстава, каб забраць яго з сям'і. А калі малы чысты, накормлены і дагледжаны, то не трэба і сталічных спецыялістаў для вынясення таго самага «прысуду» іх сям'і.

І яшчэ. Складваецца ўражанне, што прывыклі ўсе адзін аднаго пужаць пракурорам, аж смешна становіцца. Пракурор яшчэ нічога не збіраўся казаць, а ўжо дрыжаць ад яго магчымага прадпісання. А што, калі ён зараз спытае: навошта трымалі фактычна прымусова столькі часу жанчыну з дзіцем у стацыянары? У бальніцы людзі, як вядома, знаходзяцца па медыцынскіх паказаннях, а не па чыноўных загадах.

выканаць пастанову. Яшчэ прыводзіўся такі аргумент наконт немагчымасці нянькі, пра якую загаварылі ў кантэксце гэтай гісторыі. Нянька — чалавек, наняты на працу, яна не будзе адказваць, калі дзіця, не дай бог, разаб'е нос. А, напрыклад, апекуна можна прыцягнуць да адказнасці. Цікава, калі дзіця падае і разбівае нос у звычайнай сям'і, ніхто да адказнасці не прыцягваецца. Выходзіць, дыскрымінацыя?

Яшчэ ў Івацэвічах даводзілася чуць такую прапанову: калі ўжо радавому раённаму выпадку надаюць вялікую ўвагу ў сталіцы, то хай

Хутчэй за ўсё, ніхто нікога не будзе пытаць, і ўсё неўзабаве забудзецца пра гучную гісторыю. Як у тым анекдоце: дарэмна баяліся.

**У гэтай гісторыі самае прыкрае, самае абсурднае, самае брыдкае, што мне давялося чуць: «Ёй жа прапаноўвалі зрабіць аборт, яна адмовілася».**

Пішу гэтыя радкі зусім не для таго, каб паказаць, якія ў Івацэвічах дрэнныя чыноўнікі. Якраз не горшыя за іншых сваіх калег. А чаму такая сітуацыя склалася ў адным асобна ўзятым райцэнтры? Думаю, таму што мы такія. Усё грамадства. На жаль, мы яшчэ не дараслі да цывілізаванага стаўлення да інвалідаў. Нібы саромеемся, што побач крыху іншыя людзі. Традыцыя гэтага здрадніцкага сораму каранямі ўрасла ў свядомасць з савецкіх часоў. І гэта не лепшая спадчына савецкага мінулага. Тады інвалідаў наогул як быццам не было. Яны сядзелі ў дамах, кватэрах, ніхто не клапаціўся пра безбар'ернае асяроддзе для іх. Цяпер загаварылі, пачалі будаваць пандусы, спецыяльныя поручні і нават асобныя санвузлы ў грамадскіх месцах. На словах клапоцімся, на справе часта застаецца па-ранейшаму. І на работу могуць не ўзяць, каб не псаваць офіснай карцінкі (не разбіраючыся, наколькі ў таго ці іншага чалавека магчымасці абмежаваныя). А ў гэтай гісторыі самае прыкрае, самае абсурднае, самае брыдкае, што мне давялося чуць: «Ёй жа прапаноўвалі зрабіць аборт, яна адмовілася». Выходзіць, правільна адмовілася, нарадзіла здаровае дзіця, якое, трэба думаць, стане падарункам яе непростага лёсу, сэнсам жыцця і апорай у старасці.

Пішу яшчэ для таго, каб і ў іншых гарадах асцярожна падыходзілі да справы, вынікам якой можа быць разбурэнне сям'і. Галоўнае права дзіцяці — быць з бацькамі, якія яго любяць. Пра гэта варта памятаць. Гэта ж не першы ў краіне выпадак, калі бацькі-інваліды выхоўваюць сваё дзіця. Такія сем'і можна знайсці ў кожным горадзе. Яўген Семяновіч з Баранавіч, сын інвалідаў, напісаў нават адкрыты ліст у падтрымку сям'і Бахураў. Тут, праўда, справа ўскладняецца тым, што абое — інваліды першай групы. Але ж інваліды таксама бываюць розныя. У дакуменце запісана, што не могуць такія людзі выконваць абавязкі бацькоў. А калі асобныя ўсё ж могуць, то не трэба пазбаўляць іх гэтай радасці.

...Аня атрымлівала віншаванні, адказвала на іх крыху разгублена і сумбурна, сказала: «Добра, што ва ўрадзе нашым ёсць жанчыны» і што нарэшце ўсё вырашылася, што яна ўдзячная ўсім, хто яе падтрымліваў. Застаецца пажадаць іх сям'і шчасця.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

*Івацэвіцкі раён.*